УДК 378.147

В. А. Кузьміч, заг. кафедры

# МЕТАД ПРАЕКТАЎ ЯК ФОРМА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

This article deals with practical realization of a case study method in education and upbringing. Main stages of projects realization and proper methodical advice are presented here. The description of methodological base of the method is considered in this article. Experience of Belarusian language department of BSTU in this field is summarized and illustrated.

Праблема пошуку новых, нетрадыцыйных формаў навучання і выхавання ў Беларусі надзвычай актуальная. Улічваючы напрамкі ідэйна-выхаваўчай працы ва ўстановах адукацыі, становіцца відавочнай неабходнасць асэнсавання нашай моладдзю задач дзяржавы ў сферы адукацыі, якія скіраваны на выхаванне грамадзян, адданых сваёй Радзіме і адказных за яе лёс і развіццё.

Сістэма адукацыі павінна служыць у першую чаргу грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню, а не толькі забяспечваць зменлівыя патрэбы эканомікі. Ніякая прафесійная адукацыя не гарантуе матэрыяльнага дабрабыту дзяржавы, калі ў будучых спецыялістаў не сфарміруюцца адпаведныя творчыя ўменні і навыкі. Ці кожны з выпускнікоў рэальна ўсведамляе, што ад іх патрабуецца ўменне працаваць у калектыве, умець камандаваць і нават рызыкаваць, што асабліва будуць мець вагу такія якасці, як пачуццё адказнасці і асабістая дысцыпліна, ініцыятыўнасць, творчы падыход, прафесіяналізм, імкненне да дасканаласці, здольнасці да самаразвіцця, пачуццё саперніцтва, патрыятызм.

Падрыхтоўка студэнтаў да жыцця ў сучасным свеце, развіццё ў іх здольнасцей да творчага выкарыстання ведаў, падтрымка прынцыпу самадастатковасці, развіццё жадання да навучання на працягу ўсяго жыцця – усё гэта тыя каштоўнасці, якія прафесіяналы ва ўсім свеце стараюцца ўвасобіць у межах дзяржаўнай адукацыі. Таму ад выкладчыкаў патрабуецца павышэнне якасці адукацыі праз развіццё новых методык у арганізацыі працэсу навучання, адэкватных патрабаванням будучага. Метад праектаў якраз і з'яўляецца адной з педагагічных тэхналогій, што актыўна выкарыстоўваецца ў апошні час.

Распрацоўка гэтага метаду сягае аж у 20-я гг. XX ст., а яго распрацоўшчыкам лічыцца амерыканскі педагог У. Кілпатрык. Асноўная мэта метаду праектаў – стварэнне для студэнтаў магчымасцяў для самаадукацыі з дапамогай рашэння практычных задач ці праблем, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з разнастайных прадметных абласцей. Дарэчы, пры навучанні мовам метад праектаў стаў асабліва актыўна выкарыстоўвацца ў канцы 80-х гг. XX ст., асабліва выкладчыкамі замежных моў.

Паводле метаду, які дамінуе ў праекце, вылучаюць наступныя віды праектаў: даследчыя, творчыя, прыгодніцкія і гульнёвыя, інфармацыйныя, практычна-накіраваныя. Кафедрай беларускай мовы рэалізоўваліся ўсе гэтыя віды, у тым ліку прыгодніцкія і гульнёвыя (прэзентацыі казак для дзяцей у дашкольных установах).

Паводле колькасці ўдзельнікаў выкарыстоўваліся і індывідуальныя, і парныя, і групавыя праекты. Паводле працягласці правядзення распрацоўваліся доўгатэрміновыя праекты да знамянальных дат (60-годдзе Вялікай Перамогі, 75-годдзе БДТУ) і праекты сярэдняй працягласці да юбілеяў пісьменнікаў (75-годдзе з дня нараджэння У. Караткевіча і 100-годдзе з дня нараджэння П. Броўкі; 95-годдзе з дня нараджэння В. Бергольц).

Уключаючы ў вучэбна-выхаваўчы працэс метад праектаў, асабліва важна ўсведамляць, што студэнцкія праекты ўяўляюць сабой адлюстраванне розных бакоў грамадскага жыцця краіны. Акрамя таго, праект павінен спалучаць тэорыю і практыку, змяшчаць у сабе не толькі пастаноўку творчай задачы, але і яе практычнае вырашэнне. Пры падрыхтоўцы праекта студэнты павінны больш працаваць самастойна.

Спецыфікай метаду праектаў абумоўлены яго значны выхаваўчы патэнцыял. Дзякуючы сваёй практычнай накіраванасці на вырашэнне пэўнай задачы метад праектаў не толькі спрыяе фарміраванню пэўнага вопыту ў мэтанакіраваным вырашэнні пастаўленых задач, але выводзіць выхаваўчы працэс з рамак навучальнай установы ў навакольны свет, у сацыяльнае асяроддзе, уключае студэнтаў у грамадскае жыццё краіны.

Акрамя таго, выкарыстанне метаду праектаў дапамагае развіваць у студэнтаў такія неабходныя для будучага прафесійнага і грамадскага жыцця якасці, як уменне працаваць

у групе, ініцыятыўнасць, творчы падыход, імкненне да ўдасканалення, здольнасць да самаразвіцця, пачуццё саперніцтва, патрыятызм.

Хоць метад праектаў арыентаваны ў першую чаргу на самастойную працу студэнтаў, але выкладчык таксама адыгрывае важную ролю ў падрыхтоўцы праекта. У прыватнасці, ён павінен уключаць студэнта ў працэс вырашэння праблемы, выкарыстоўваючы пры гэтым навуковыя метады; падаваць студэнтам інфармацыю, якая абудзіць іх матывацыю да творчай дзейнасці, г. зн. заахвоціць іх да самастойнай творчай працы; развіваць у навучэнцаў уменні і навыкі, звязаныя з вырашэннем пастаўленых задач, наладжваць сістэматычнае і пастаяннае ўзаемадзеянне членаў творчага калектыву, калі праект выконваецца ў групе; нарэшце, выкладчык павінен уласным прыкладам паказваць, якімі асабістымі характарыстыкамі павінна валодаць сучасная творчая асоба.

Як паказвае вопыт айчыннай і замежнай педагогікі, метад праектаў можа эфектыўна прымяняцца пры навучанні розным дысцыплінам, у тым ліку і лінгвістычным. У той жа час для паспяховага выкарыстання дадзенага метаду неабходна ўлічваць спецыфіку не толькі канкрэтнай дысцыпліны, але і асаблівасці кожнага тыпу праектаў.

Так, для арганізацыі пазааўдыторных праектаў патрэбны значныя знешнія стымулы (узнагароды, прызы, магчымасць прадэманстраваць вынікі шырокаму колу людзей і г. д.) і значная дадатковая затрата часу як з боку студэнтаў, так і выкладчыкаў.

Пры рэалізацыі метаду праектаў у вучэбна-выхаваўчай працы выкладчыку неабходна звяртаць увагу на тое, каб гэты метад не разглядаўся спрошчана як нейкі алгарытм, які абавязкова вядзе да творчага развіцця асобы. Для эфектыўнасці метаду патрэбна сур'ёзная і самаадданая праца як выкладчыка, так і студэнтаў. Пры ажыццяўленні метаду праектаў трэба пазбягаць таксама дагматызму. Інакш кажучы, нельга лічыць гэты метад толькі адзіным сродкам вучэбна-выхаваўчай працы, яго варта спалучаць з іншымі методыкамі, выкарыстоўваючы пры гэтым індывідуальны падыход.

Трэба адзначыць, што адпаведная дыдактычная і метадычная падрыхтоўка выкладчыкаў кафедры беларускай мовы дазволіла не толькі пазбегнуць гэтых цяжкасцяў пры рэалізацыі метаду, але і пашырыла перспектыву яго прымянення ў выхаваўчым працэсе.

Мова, як мы ведаем, – гэта асноўны інструмент выхавання, таму пры рэалізацыі тых праектаў, якія распрацоўваліся кафедрай, улічваліся як навучальныя, так і выхаваўчыя задачы. На прыкладзе працы кафедры разгледзім наступныя этапы рэалізацыі метаду праектаў у вучэбна-выхаваўчай працы.

1. Найперш, гэта вызначэнне тэмы праекта, пры гэтым яна павінна адпавядаць патрэбам сённяшняга дня і быць цікавай для студэнтаў (адзначым найбольш значныя праекты, рэалізаваныя на кафедры: «Ніхто не забыты, нішто не забыта» (да 60-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне), «І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх», «БДТУ вачыма маладых», «За здаровы лад жыцця»).

2. Вызначэнне праблем і мэт праекта.

3. Абмеркаванне праекта, складанне прыкладнага плана работы (спачатку план абмяркоўваецца ў групах, а затым прадстаўнікі груп выбіраюць самыя цікавыя прапановы для рэалізацыі агульнага праекта).

4. Прэзентацыя неабходнага моўнага матэрыялу і перадкамунікатыўная трэніроўка (напрыклад, для рэалізацыі праекта да 60-годдзя Перамогі праведзены шэраг сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, экскурсіі ў музей Вялікай Айчыннай вайны; тэматычныя гутаркі: «Мужнасць, гордасць за свой род, свой народ – аснова ідэалогіі нашай дзяржавы», «Моладзь выхоўваецца на подзвігах», «Яны вызвалялі наш край», «Любіце, а не ваюйце», «Беларусь – край партызанскай славы», «Без мінулага няма будучыні» і інш. Таксама гэта правядзенне дыспутаў «Абавязак. Гонар. Слава», акцый «Ветэран жыве побач», віктарын «Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны?», конкурсу на лепшага чытальніка вершаў аб вайне, у тым ліку і ўласных твораў, правядзенне экскурсій па родным краі (ваенна-гістарычны маршрут, напрыклад, «Помнікі і памятныя месцы Мінскага партызанскага падполля», «Мемарыяльныя дошкі, помнікі славутым военачальнікам і партызанам», «Вайсковыя могілкі» і г. д).

5. Збор інфармацыі, праца з крыніцамі інфармацыі (уласнае даследаванне паводле матэрыялаў з хатніх архіваў і стварэнне паводле іх радаводаў, творчых прац). Гэта праца ў бібліятэках і архівах музеяў Вялікай Айчыннай вайны (Мінск, Калінкавічы, Ушачы і інш.).

6. Праца ў групах, парах, індывідуальныя міні-праекты (стварэнне відэафільмаў і правядзенне паводле іх куратарскіх відэагадзін).

7. Рэгулярныя сустрэчы, падчас якіх студэнты абмяркоўваюць прамежкавыя вынікі (у межах гурткоў «Памяць», «Пазнай свой край», «Спадчына», «Мая Радзіма – Беларусь» і інш.). Затым праводзіцца прэзентацыя творчых прац у студэнцкіх групах.

8. Аналіз сабранай інфармацыі, каардынацыя дзейнасці разнастайных груп. Выкладчыкі-кіраўнікі праектаў падагульняюць усе напрацоўкі, абмяркоўваюць іх і рэкамендуюць да шырокай прэзентацыі.

9. Падрыхтоўка прэзентацыі праектаў (выставкі, канферэнцыі, агульнаўніверсітэцкія вечарыны, тэатральныя прадстаўленні, кураторскія гадзіны, выступленні з праектамі ў іншых навучальных установах (школы, гімназіі, ліцэі). Так, напрыклад, кафедрай сумесна з Саюзам блакаднікаў Ленінграда ў Беларусі і іншымі грамадскімі арганізацыямі была праведзена вечарына, прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння В. Бергольц. Агляд студэнцкіх праектаў з'яўляецца абавязковым падчас правядзення навукова-практычных канферэнцый, сугучных з тэмай праекта.

10. Дэманстрацыя вынікаў праекта (кульмінацыйны пункт працы над праектам). У дадзеным выпадку агульны праект, прысвечаны 60-годдзю Перамогі, быў прадстаўлены на VIII Рэспубліканскай выставе па тэме «Ідэалагічнае суправаджэнне і маніторынг выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі» (11–15.04.2005). У рамках праекта было падрыхтавана 314 экспанатаў (творчыя даследаванні студэнтаў, радаводы, навуковыя студэнцкія працы, відэафільмы, літаратурныя працы). Праект дэманстраваўся таксама на Міжнароднай сустрэчы партызанаў, падпольшчыкаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і прадстаўнікоў Сусветнай федэрацыі ветэранаў вайны (Палац Рэспублікі – 30.04.2005). Выстава сабрала шырокае прадстаўніцтва дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, якія станоўча ўспрынялі прадстаўлены матэрыял. Аналагічныя выставы да 60-годдзя Перамогі дэманстраваліся ў БДТУ.

11. Ацэнка праектаў. Дадзены этап уключае ў сябе кантроль засваення моўнага матэрыялу і развіцця маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцыі (ацэньваецца персанальна кожны ўдзельнік праекта, яго самастойны ўклад у развіццё тэмы, вызначаюцца пераможцы, накіроўваецца прадстаўленне да рэктара аб узнагароджанні пераможцаў).

Вынікі ж працы кафедры беларускай мовы над агульным праектам «Ніхто не забыты, нішто не забыта» (да 60-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне) былі ацэнены Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. БДТУ быў адзначаны Дыпломам I ступені «За сістэмны падыход да распрацоўкі ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчага працэсу» і Дыпломам I ступені «За патрыятычнае выхаванне студэнтаў з выкарыстаннем матэрыялаў аб ратным і працоўным подзвігу беларусаў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».

Такім чынам, метад праектаў з'яўляецца адной з формаў пазааўдыторнай самастойнай працы, ён выкарыстоўваецца як альтэрнатыўны спосаб арганізацыі вучэбна-выхаваўчага матэрыялу. Гэты метад эфектыўна садзейнічае актуалізацыі ведаў, уменняў, навыкаў, іх практычнаму прымяненню ў канкрэтнай сітуацыі, стымулюе патрэбнасць студэнцтва ў самарэалізацыі і самавыражэнні, у асабістай і грамадскай творчай дзейнасці. Дзякуючы метаду праектаў актывізуецца самастойная дзейнасць студэнтаў, рэалізуецца прынцып супрацоўніцтва студэнтаў і выкладчыкаў, што дазваляе спалучаць калектыўнае і індывідуальнае ў педагагічным працэсе. Гэты метад паспяхова інтэгруецца ў традыцыйную сістэму навучання мове і дазваляе арганічна ажыццяўляць у вучэбна-выхаваўчым працэсе ідэалагічныя прынцыпы нашай дзяржавы, скіраваныя на выхаванне патрыятызму нашай моладзі і яе адданасці роднай краіне.

**Літаратура**

1. Самерсова Н. В. Проект как метод экологического воспитания школьников // Народная асвета. – 2005. – № 10. – С. 81–87.

2. Самерсова Н. В., Кошель Н. Н., Петрова С. А. Экологическая инициатива. – Мн., 2005. – С. 52–61.

3. Современная гимназия: взгляд теоретика и практика / Под ред. Е. С. Полат. – М., 2000.

4. Гузеев В. В. Образовательная технология: от приема до философии. – М., 1996.

5. Новые педагогические и информационные технологии в системе образования / Под ред. Е. С. Полат. – М., 2000.